# ДА МІЖНАРОДНАГА ДНЯ СЕМ'ЯЎ

***Свята было абвешчана Генеральнай Асамблеяй ААН 20 верасня 1993 года. Штогод да гэтай даты выбіраецца пэўная тэма. Сёлета яна гучыць так: «Сям'я і інклюзіўнае грамадства».***

***У сувязі з гэтым днём супрацоўнікі, выкладчыкі і студэнты нашага ўніверсітэта не засталіся ў баку і арганізавалі мерапрыемствы, пра якія расказваюць нашы пазаштатныя карэспандэнты.***

## САМАЕ ДАРАГОЕ Ў ЖЫЦЦІ

15 мая ў фае актавай залы галоўнага корпуса нашай альма-матар падчас аднаго з перапынкаў супрацоўнікі аддзела па выхаваўчай рабоце з моладдзю і супрацоўнікі сацыяльна-педагагічнай і псіхалагічнай службы ўніверсітэта правялі акцыю, прысвечаную Міжнароднаму дню сям'ў.

Гучала прыгожая мелодыя, якую выконваў на саксафоне студэнт 1-га курса факультэта матэматыкі і інфармацыйных тэхналогій Яўген Безвадзіцкі. Для прысутных была арганізавана займальная віктарына «Самае дарагое, што ёсць у мяне, – гэта сям'я». Вядоўцы падзяліліся дзесяццю сакрэтамі моцнай сям'і. Кожны ахвотны меў магчымасць прайсці экспрэс-дыягностыку, даведацца пра свае асобасныя асаблівасці, вызначыць асабістую гатоўнасць да сямейнага жыцця. Акрамя гэтага, была арганізавана выстава малюнкаў дзяцей выкладчыкаў і супрацоўнікаў нашай ВНУ. Хлопчыкі і дзяўчынкі намалявалі свае сем'і. Дзейнічала таксама тэматычная фотазона, дзе можна было зрабіць памятныя фотаздымкі. Адным словам, мерапрыемства прайшло ў цёплай, пазітыўнай, сяброўскай атмасферы.

**Анастасія МАРОЗАВА,**
**студэнтка 1-га курса ФлФ.**



Фота В. ЛУЗГІНОЙ.